УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»
Інстытут павышэння кваліфікацыі и перападрыхтоўкі
Факультэт кіравання і прафесійнага развіцця педагогаў
Кафедра мэнэджмента і адукацыйных тэхналогій

# МАРАЛЬНА-ДУХОЎНАЕ ВЫХАВАННЕ ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ СРОДКАМІ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ КАЗКІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Курсавая работа
слухача другога года навучання
групы ДО - 175 спецыяльнасці
перападрыхтоўкі 1-01 03 72
«Дашкольная адукацыя»
завочнай формы
атрымання адукацыі
Навумчык Алены Аляксееўны
Навуковы кіраўнік:
Зямцова Алена Антонаўна
старшы выкладчык кафедры
Абаронена
__20.09__ 2018
з адзнакай_7_(_сем_)

Мінск, 2018

## АННОТАЦИЯ

В курсовой работе Наумчик Е.А. "Нравственно – духовное воспитание детей дошкольного возраста средствами белорусской народной сказки" раскрывается сущность и природа духовности, понятие нравственности, рассмотрены особенности формирования нравственно-духовных качеств у детей дошкольного возраста, акцентируется внимание на роли белорусской народной сказки в нравственно-духовном воспитании детей дошкольного возраста.

В работе проанализированы белорусские народные сказки, которые рекомендует "Учебная программа дошкольного образования", даны методические рекомендации по использованию белорусских нородных сказок в нравственно-духовном воспитании детей дошкольного возраста.

## АНАТАЦЫЯ

У курсавой рабоце Навумчык А.А. "Маральна-духоўнае выхаванне дзяцей дашкольнага ўзросту сродкамі беларускай народнай казкі" раскрываецца сутнасць і прырода духоўнасці, паняцце маралі, разледжаны асаблівасці фарміравання маральна-духоўных якасцей у дзяцей дашкольнага ўзросту, акцэнтуецца ўвага на ролі беларускай народнай казкі ў маральна-духоўным выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту.

У працы прааналізаваны беларускія народныя казкі, якія рэкамендуе "Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі", даны метадычныя парады по выкарыстанню беларускіх народных казак у маральна-духоўным выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ANNOTATION

Naumchik E.A. in the course work. "The moral and spiritual education of children of preschool age by the means of the Belarusian folk tale" reveals the essence and nature of spirituality, the notion of morality, considers the features of the formation of moral and spiritual qualities in preschool children, focuses on the role of the Belarusian folk tale in the moral and spiritual upbringing of preschool children.

The work analyzes the Belarusian folk tales, which are recommended by the "Curriculum of preschool education", the methodical recommendations on the use of Belarusian fairy tales in the moral and spiritual upbringing of preschool children are given.

## ЗМЕСТ


УСТУП 3

ГЛАВА 1 МАРАЛЬНА-ДУХОЎНАЕ ВЫХАВАННЕ ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ 5

1.1 Сутнасць і прырода духоўнасці, паняцце маралі 6

1.2 Асаблівасці фарміравання маральна-духоўных якасцей у дзяцей дашкольнага ўзросту 6

1.3 Роля беларускай народнай казкі ў маральна-духоўным выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту 7

ГЛАВА 2 ШЛЯХІ І СРОДКІ МАРАЛЬНА-ДУХОЎНАГА ВЫХАВАННЯ ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ СРОДКАМІ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ КАЗКІ 13

2.1 Аналіз беларускіх народных казак па "Вучэбнай праграме дашкольнай адукацыі" 13

2.2 Метадычныя парады по выкарыстанню беларускіх народных казак у маральна-духоўным выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту 14

ЗАКЛЮЧЭННЕ 20

СПІС СКАРЫСТАНЫХ ВЫТОКАЎ 22


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# УСТУП

Праблема духоўнага выхавання падрастаючага пакалення заўседы была цяжкай і супярэчлівай.

Ва ўсе часы людзі высока цанілі духоўнасць. Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні, якія адбываюцца ў сучасным грамадстве, прымушаюць нас разважаць аб будучыні Беларусі, яе моладзі. У наш час матэрыяльныя каштоўнасці дамініруюць над духоўнымі, таму ў дзяцей бывае скажонае ўяўленне аб дабрыні, міласэрнасці, велікадушшы, справядлівасці, грамадзянстве і патрыятызме.

Праблемы духоўнасці, маральна-духоўнага выхавання дзяцей закраналіся у працах многіх навукоўцаў, з іх: Я.А.Каменскі, Л.С.Выгоцкі, А.С.Макаранка, В.А.Сухамлінскі, С.А.Казлова, Т.А.Кулікова, з беларускіх даследчыкаў – Л.В.Ніканава, Н.В.Літвіна і інш.

Актуальнасць маральна-духоўнага выхавання сення можна вызначыць у чатырох накірунках:

Па-першае, наша грамадства мае патрэбу ў падрыхтоўцы шырока адукаваных, высока духоўных людзей, якія валодаюць не толькі ведамі, але і прыгожымі рысамі асобы.

Па-другое, у сучасным свеце маленькі чалавек жыве і развіваецца ў асяроддзі мноства разнастайных вытокаў, якія моцна ўздзейнічаюць на яго як пазітыўна, так і негатыўна. Ідзе паток інфармацыі, які ўплывае на інтэлект і пачуцці дзіцяці, на сферу духоўнасці, якакя яшчэ толькі фарміруецца.

Па-трэццяе, сама па сабе адукацыя не гарантуе высокага ўзроўня духоўнай выхаванасці, бо выхаванасць – гэта якаяць асобы, якая вызначаецца ў паўсядзенных паводзінах чалавека ў адносінах да Радзімы, да іншых людзей (паваге, дабразычлівасці, міласэрнасці і інш.), і да самаго сябе.

Па-чацвертае, узбагачэнне маральна-духоўнымі ведамі патрэбна яшчэ і таму, што яны не толькі інфармуюць дзіця аб нормах паводзін, зацверджаных у сучасным грамадстве, але і даюць уяўленні аб тым, што адбываецца, калі парушаюцца гэтыя нормы жыцця.

Як адзін са шляхоў, сродкаў фарміравання духоўных якасцей, маральных норм паводзін і зносін паміж людзьмі выступаюць казкі.

Асаблівасці казкі як сродка маральна-духоўнага выхавання падкрэслівалі К.Дз.Ушынскі, В.Р.Бялінскі, Г.Н.Волкаў (распрацаваў тэрмін этнапедагогікі).

Беларускія казкі цудоўныя ва ўсіх адносінах і маюць свае асаблівасці. У іх закладзена жыццёвая мудрасць, транслююцца духоўныя якасці і каштоўнасці, уласцівыя менавіта беларускім людзям. Беларусы вядомыя ў свеце сваёй мяккасцю, дабрынёй, талерантнасцю, смеласцю, працавітасцю, цярплівасцю, вынаходлівасцю, дасціпнасцю і выдатным пачуццём гумару. Дзякуючы гэтым якасцям мы выжывалі ў сітуацыях, дзе выжыць было амаль немагчыма. І нашы казкі гэтаму вучаць. Сярод галоўных герояў у беларускіх казках практычна няма лайдакоў, гультаёў, баязліўцаў. Мудрасць перамагае ў казках: “Не сілай, а розумам”, “Людзей слухай, а свой розум май”, “Андрэй за ўсіх мудрэй”, “Наймудрэйшы”. Увага дзіцяці звяртаецца на тое, як важна набыць жыццёвы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вопыт, быць смелым, не баяцца працы. Разам з тым беларускія казкі павучаюць, падказваюць, перасцерагаюць, развіваюць увагу, памяць, мысленне. Іх карысна ўводзіць у жыццё дзіцяці дашкольнага ўзросту [8]. Беларуская народная казка з'яўляецца тым сродкам, які дапамагае выхаванцам фарміраваць уяўленне аб сістэме каштоўнасцей свайго народа.

Крызіс існуючых сістэм каштоўнасцей у сучасным грамадстве, размыванне норм маралі ускладняюць пуці маральнага і духоўнага самавызначэння дзіцяці.

Дашкольны ўзрост – перыяд актыўнага засваення норм маралі, фарміравання духоўных звычак, пачуццяў, адносін да сябе і асяроддзя. У гэты час адбываецца станаўленне зносін з дарослымі і аднагодкамі, адаптацыя сацыяльных паводзін, уяўленне аб родным краі і адносін да яго [10].

Менавіта дашкольны ўзрост – важнейшы перыяд станаўлення асобы, калі закладваюцца передумовы якасцей чалавека - грамадзяніна, развіваюцца ўяўленні дзяцей аб чалавеку, грамадстве і культуры. Перыяд дашкольнага дзяцінства з'яўляецца адметным этапам у развіцці механізмаў паводзін і дзейнасці, першай прыступкай на шляху фарміравання асобы ў цэлым. Гэта абумоўлена вялікімі змяненнямі, якія адбываюцца у разумовым і эмацыянальна-валявым развіцці дашкольніка, у матывацыйнай сферы і зносінах [7].

З ранняга ўзросту маленькі чалавек імкнецца да самастойнасці, спрабуе спазнаць усё новае. Адным са шляхоў, якія спрыяюць усебаковаму развіццю дзіцяці, з'яўляецца чытанне казкі, бо менавіта яна вучыць яго назіраць за навакольным светам, наладжваць зносины з дарослыми и аднагодкамі, заўважаць асаблівасці роднага краю, вучыць марыць, развіваць уяўленне і фантазію. І вельмі важна, каб кніга з казкамі ўвайшла ў жыццё маленькага чалавека як мага раней.

**Мэта даследвання** – тэарытычна абгрунтаваць і метадычна падтвердзіць выкарыстанне беларускай народнай казкі як сродка маральна-духоўнага выхавання дзяцей дашкольнага узросту праз сістэму каштоўнасцей.

**Задачы даследвання:**

1. Вызначыць сутнасць духоўнасці і маралі.
2. Разглядзець асаблівасці фарміравання маральна-духоўнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту.
3. Выявиць сістэму каштоўнасцей у беларускай народнай казцы, разгледзіць беларускія народныя казкі, якія ўваходзяць у "Вучэбную праграму дашкольнай адукацыі".
4. Падабраць метадычныя парады па выкарыстанню беларускіх народных казак у маральна-духоўным выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту.

**Аб'ект даследвання** – маральна-духоўнае выхаванне дзяцей дашкольнага ўзросту.

**Прадмет даследвання** – выкарыстоўванне беларукай казкі як сродка маральна-духоўнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ